Кункевіч Г.В., студ. гр. 314 А, ТБК і СМ, БГУКМ
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М, кандыдат філалагічных навук, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АБРАД ІНІЦЫЯЦЫІ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

Ініцыяцыя (лат. “initiare”, “initiatio” - пасвячэнне, пачатак, уступ) – гэта абрад пасвячэння, які звязаны з пераходам чалавека альбо групы людзей у новы полаваўзроставы ці сацыяльны статусы [4, 17]. Ініцыяцыя вядома са старадаўніх часоў, яна выконвала функцыі навучання, выхавання і сацыялізацыі чалавека. У такім выпадку мы можам назваць яе грамадскім інстытутам, бо жыццё старажытных людзей без яе было немагчыма.

Ініцыяцыя суправаджалася асобным комплексам рытуалаў. Яны мелі адрозненні ў залежнасці ад тыпу ініцыяцыі: ініцыяцыя магла быць звязана з фізічнай сталасцю неафіта (звычайна праводзілася індывідуальна), з сацыяльным становішчам чалавека (калектыўная форма), ці з пасвячэннем у шаманы (мела найбольш глыбокі і містычны характар).

Структура ініцыяцыі разглядалася многімі даследчыкамі. Існуюць розныя меркаванні на гэту тэму, аднак найбольш грунтоўным, на наш погляд, з’яўляецца даследванне нямецкага вучонага А. ван Геннэпа. Ён вылучаў тры стадыі ініцыяцыі: сепаратыўная (абрад “выключэння” з сям’і, абшчыны); лімінальная (пагранічная стадыя, “часовая” смерць); рэабілітацыйная (абрад вяртання, замацавання ў новым статусе) [3, 95].

Такую паслядоўнасць стадый ініцыяцыі можна знайсці ў літаратуры славян, у прыватнасці, у казках. Абапіраючыся на даследванне рускага этнографа У. Пропа, мы можам сцвярджаць, што казка захавала сляды старажытнай ініцыяцыі юнакоў, і на гэтай выснове вызначыць пэўныя асаблівасці абраду [5, 41]. Так, у ініцыяцыі заўсёды былі “вучні” і “настаўнік” – паважаны чалавек, які валодаў неабходнымі ведамі і выступаў ў ролі пасрэдніка паміж людзьмі і вышэйшымі сіламі. Вядома, што

старажытны абрад складаўся з асобных этапаў і пачынаўся з таго, што неафіта забіралі ад сям'і (ініцыятарам з'яўляуся бацька) і вялі ў лес. Лес выступаў сімвалам іншасвету, варожасці, з'яўляўся пагранічнай зонай. Далей праводзіўся этап рытуальнай ці "часовай" смерці. Ён адбываўся шляхам фізічных выпрабаванняў і іспытаў (падлетку адразалі часткі цела - пальцы, вушы, абрад абразання). Пасля гэтага праходзіў этап адраджэння, на якім давалі новыя імёны, прывучалі да прымітыўных дзеянняў (лічылася, што тыя, хто вяртаўся з "таго" света, забывалі зямное жыццё і былі падобны да дзіцяці). Абавязковым з'яўляўся этап навучання, дзе хлопец набываў звычкі воіна і паляўнічага, вывучаў рэлігійныя высновы і гістарычныя паданні і г.д. Завяршалася ініцыяцыя этапам вяртання, у якім прымала ўдзел уся абшчына. Ён праводзіўся ўрачыста, бо кожны дарослы чалавек узмацняў племя, паказваў яго моц. Такім чынам, ініцыяцыя дазваляла юнакам набываць статус дарослага мужчыны і атрымоўваць звязаныя з ім правы і прывілеі (зарабляць грошы, удзельнічаць ў спаборніцтвах, піць спіртное і курыць, сватацца да дзяўчын і г.д.) [5, 43-45].

Трэба адзначыць, што Проп разглядаў прыклад мужчынскіх ініцыяцый, якія даволі часта сустракаюцца ў казках. Сведак пра жаночыя ініцыяцыі захавалася значна менш, і амаль усе – гэта дакладна зафіксаваныя абрады паўднёваамераканскіх, афрыканскіх і сярэднеазіяцкіх плямёнаў (М. Эліадэ).

Каб быць аб'ектыўнымі, разгледзім адметнасці і жаночых ініцыяцый. Яны мелі падобную паслядоўнасць з мужчынскімі ініцыяцыямі, але вылучаліся шэрагам забарон. У шматлікіх выпадках сюды ўваходзілі маўклівасць, асобая ежа і пітво, забарона на рознаколернае адзенне, забарона бачыць сонечны свет, дакранацца да зямлі і інш. Такія ініцыяцыі маглі займаць да 5 год, але ў асноўным былі больш кароткімі. Мэтай жаночых ініцыяцый з'яўлялася адкрыццё жаночай "прыроды", разуменне яе мацярынскай сутнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна вылучыць аднолькавыя для ўсяго старажытнага сусвету рысы ініцыяцыі: яна была абавязкова для ўсіх членаў абшчыны без выключэння; заўсёды праходзіла пад кіраўніцтвам найбольш вопытных супляменнікаў; з'яўлялася школай, якая знаёміла неафітаў са свяшчэннымі паданнямі і вераваннямі, пасвячала ў таямніцы племя; у залежнасці ад узросту чалавека, ініцыяцыя магла змяняць сваю паслядоўнасць, але усе тры стадыі (сепаратыўная, лімінальная і рэабілітацыйная) былі асновай для існавання абраду; галоўнай ўмовай была ізаляцыя ад сям'і і супрацьлеглага полу; неабходным было выкарыстанне сімвалічных прадуктаў (яйкі, бліны, малако); абавязкова пасля ініцыяцыі адбываліся змены ў адзенні і знешнасці чалавека (косы, ленты, аздабленні, панёва – ў дзяўчын; вусы, чуб, зброя – ў хлопцаў); кожная паспяховая ініцыяцыя з'яўлялася важнай падзеяй для любой абшчыны, таму вяртанне людзей да дому адзначалася вельмі святочна і цэрыманіяльна.

Зыходзячы з вывучаных крыніц, можна зрабіць выснову, што ўсе мэты ініцыяцыі, уся сутнасць абраду была накіравана на тое, каб прывучыць падлеткаў да дарослага жыцця, пазнаёміць з новымі сацыяльнымі ролямі, дапамагчы знайсці сваё месца ў жыцці.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Балушок, В. Г. Инициации древних славян (попытка реконструкции)// Этнографическое обозрение. 1993. №4

2. Велецкая, Н. Н. Языческая символика славянских архаических ритуалов / Н. Н. Велецкая. – 2-е изд., исп. и доп. – М. : София, 2003. – 237 с.

3. Геннеп, ван А. Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов. М., 1999. - 141 с.

4. Ефимкина, Р.П. Пробуждение Спящей красавицы: психологические инициации женщин в волшебных сказках / Р. П. Ефимкина. - СПб. : Речь, 2010. – 262 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Пропп, В. Я. Морфология волшебной сказки; Исторические корни волшебной сказки / В. Я. Пропп. - М.: Лабиринт, 1998. – 511 с.

6. Пропп, В. Я. Русские аграрные праздники: Опыт ист.-этногр. исследования / В. Я. Пропп. – СПб.: Азбука, 1995. - 174 с.

7. Рыбаков, Б. А. Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков. - М.: София, 2002. – 586 с.

8. Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под общ. ред. Н. И. Толстого. Т 4. – М.: Международные отношения, 2009. – 656 с.

9. Фрэзер, Дж. Золотая ветвь. М., 1980. - 831 с.

10. Элиаде, М. Шаманизм: архаические техники экстаза. – Киев: София, 1998. - 378 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ